**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ЧАЦВЕРЫКОЎ ВІТАЛЬ ПАЎЛАВІЧ

**КІНАРЭЖЫСЁР, ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВА БССР,**

**НАРОДНЫ АРТЫСТ БССР**

**16 ЖНІЎНЯ 1933 Г. – 26 ЖНІЎНЯ 1983 Г.**

**ФОНД № 431**

**ВОПІС № 2**

**[1949]–1983 гг. , асоб. дак. 1996 г.**

**МІНСК 2024**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 2 ф. 431**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1 | ФАТАГРАФІІ Ў РОЛЯХ І ПАДЧАС ЗДЫМКАЎ ФІЛЬМАЎ В.П. ЧАЦВЕРЫКОВА | 1-13 | |
| 2 | АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ В.П. ЧАЦВЕРЫКОВА | 14-16 | |
| 3 | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 17-20 | |

## Прадмова

**Чацверыкоў Віталь Паўлавіч** нарадзіўся 16 жніўня 1933 г. у горадзе Алма-Ата (Казахстан) у сям'і вайскоўца. Пасля сканчэння 8-мі класаў пераехаў у Саратаў (Расія), дзе ў 1949 г. паступіў у Саратаўскае ваенна-марское падрыхтоўчае вучылішча. У 1952 г. В.П. Чацверыкоў быў залічаны ў Ленінградскае ваенна-марское вучылішча[1]. Пасля сканчэння вучылішча быў накіраваны ў 4 Ваенна-марскі флот (далей ВМФ) інструктарам тэхнікі-аўтаматыкі. Быў дэмабілізаваны з ВМФ у сакавіку 1956 г. У тым жа годзе паступіў на акцёрскае аддзяленне ва Ўсесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі (цяпер Усерасійскі дзяржаўны ўніверсітэт кінематаграфіі імя С.А. Герасімава). Там ен займаўся 3 курсы ў майстэрні актрысы тэатра і кіно, педагога, рэжысёра, заслужанага дзеяча РСФСР і Таджыкскай ССР О.І. Пыжовай. Пасля гэтага быў пераведзены на рэжысёрскі факультэт у майстэрню кінарэжысёра, педагога, тэарэтыка кіно, лаўрэата 2-х Сталінскіх прэмій Р.М. Козінцава і рэжысёра, сцэнарыста, педагога С.К. Скварцова.

Першай акцёрскай працай В.П. Чацверыкова стала роля Мечыка ў мастацкім фільме "Юность наших отцов" рэжысёраў М.Н. Каліка і Б.У. Рыцарава, які выйшаў у пракат у 1958 г. Пасля Віталь Паўлавіч зняўся ў фільме "Колыбельная" у 1959 г. рэжысёра М.Н. Каліка.

У 1961 г. завяршыў тэарэтычны курс "ВГИКа" і паступіў рэжысёрам-практыкантам на кінастудыю "Малдова-фільм", дзе супрачоўнічаў з М.Н. Калікам. Пасля, у 1962 г., для выканання дыпломнага праэкта быў накіраваны на кінастудыю "Беларусьфільм". Уся далейшая яго праца і ўсе ягоныя фільмы былі звязаны і зроблены на гэтай кінастудыі. Ён зняў іграв ыя фільмы: "Саша-Сашенька" (1966), "Руины стреляют…" (дакументальна-іграв ы тэлефільм, 1971-1972), "Пламя" (1974), "Время-не-ждёт" (тэлефільм, 1974), "Черная берёза" (1977), "Половодье" (1980), "Затишье" (тэлефільм, 1981), "Глядите на траву" (1983), "Сад" (1983) і дакументальныя фільмы: "Белорусская рапсодия" (1965), "Казнён в 41-м" (1967), "Мне хотелось рассказать" (1968).

За здымкі фільма "Руины стреляют…" В.П. Чацверыкову была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР у 1974 г. Заслужаны дзеяч мастацтва БССР (1974). Кінакарціна "Пламя" была адзначана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1975), Вярхоўнага Савета Літоўскай ССР (1975). На VIII Усесаюзным кінафестывале ў Кішынёве (Малдова) В.П. Чацверыкоў быў узнагароджаны срэбраным медалём за "лепшы твор на гераічна-патрэатычную тэму" (1975). У 1976 г. занесены ў Кнігу Пашаны Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі. Народны артыст БССР (1979). Творчы калектыў фільма

[1] Звесткі паводле аўтабіяграфіі В.П. Чацверыкова. Гл. БДАМЛМ, фонд №431, воп. 1, спр. 241, л. 1

“Половодье” атрымаў прыз “за лепшы фільм аб людзях вёскі” на XIV Усесаюзным кінафестывалі ў Вільнюсе (Літва).

В.П. Чацверыкоў памёр 26 жніўня 1983 г.

Дакументы з асабістага архіва В. П. Чацверыкова паступілі ў БДАМЛМ ад удавы рэжысёра Жанэты Пятроўны ў чэрвені 2006 года.

Вопіс складаецца з 3 раздзелаў.

Першы раздзел “Фатаграфіі ў ролях і падчас здымкаў фільмаў В.П. Чацверыкова” састаўлены з фатаграфій яго першых роляў і кінапробаў кадраў з гэтых фільмаў; з фатаграфій рабочых момантаў здымак і кадраў яго фільмаў, кінапробаў акцёраў да гэтых фільмаў і інш. [1956] – (1983, асобны дакумент 1996).

Другі раздзел “Асабістыя дакументы В.П. Чацверыкова” ўключае ў сабе ганаровую грамату, дыпломы, пісьмо ўдзячнай глядачкі на імя В.П. Чацверыкова, дароўныя надпісы і інш. (1958-1982).

Трэці раздзел “Выяўленчыя дакументы” прадстаўлены індывідуальнымі фатаграфіямі В.П. Чацверыкова, фатаграфіямі на адпачынку з калегамі і інш. [1949-1970-я гг.].

Прадмову склала
Вяд. архівіст Л. А. Дударэвіч
15.02.2024

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-
музей літаратуры і мастацтва"

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 11.06.2024
№ 7

ФОНД № 431,
ВОПІС № 2
[1949]–1983 гг., асоб. дак. 1996 г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **ФАТАГРАФІІ Ў РОЛЯХ І ПАДЧАС ЗДЫМКАЎ ФІЛЬМАЎ В.П. ЧАЦВЕРЫКОВА** | | | | |
| 1 | Фатаграфіі студэнцкіх роляў В.П. Чацверыкова, індывідуальныя і ў групе з неўстаноўленымі асобамі | [1956-1962] | 5 | 5 | |
| 2 | Фатаграфіі кінапроб В.П. Чацверыкова да фільма "Юность наших отцов". Фатаграфіі рабочых момантаў здымак і кадраў гераічнай кінааповесці гэтага фільма (рэж. М.Н. Калік і Б.У. Рыцараў) з удзелам В.П. Чецверыкова, А.Я. Куцепава, неўстаноўленых асоб | 1957-1958 | 12 | 12 | |
| | *** | | | | |
| 3 | Фатаграфіі рабочых момантаў здымак і кадраў дыпломнай працы "Война и мир" В.П. Чацверыкова з удзелам яго самаго і неўстаноўленымх асоб | [1962] | 5 | 5 | |
| 4 | Фатаграфія кінапробы В.П. Чацверыкова да дакументальнага фільма "Экипаж сетлофоров". Фатаграфіі кадраў, масавых сцэн гэтага фільма В.П. Чацверыкова з удзелам яго самога і неўстаноўленых асоб | 1965 | 3 | 3 | |
| 5 | Фатаграфіі кінапроб Ю.М. Мядзведзева, Л.Г. Прыгунова, Н.І. Селязнёвай, Н.С. Шацкай да фільма "Саша-Сашенька". Фатаграфіі рабочых момантаў здымак і кадраў гэтага фільма (рэж. В.П. Чацверыкоў) з удзелам У.С. Высоцкага, Ю.М. Мядзведзева, Л.Г. Прыгунова, І. Рэмішэўскага (аператар), Н.І. Селязнёвай, Н.С. Шацкай і неўстаноўленых асоб | 1966 | 18 | 18 | |
| | *** | | | | |
| 6 | Фатаграфія кінапроб П.В. Кармуніна да тэлефільма "Руины стреляют…" Фатаграфіі рабочых момантаў здымак, кадраў, масавых сцэн гэтага тэлефільма (рэж. В.П. Чацверыкоў) з удзелам Г.С. Аўсяннікава, Б.А. Аліфера (аператар), М.А. Глузскага, [У. Іванова] і неўстаноўленых асоб | 1971-1972 | 14 | 14 | |
| 7 | Фатаграфіі натуры і дэкарацый да мастацкага | [1971-1972] | 12 | 12 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | фільма ["Руины стреляют…"] В.П. Чацверыкова | | | | |
| 8 | Фатаграфіі рабочых момантаў здымак, кадраў мастацкага фільма "Пламя" В.П. Чацверыкова з удзелам А.А. Кабаладзэ, Ю.І. Каюрава, А. Шурна | 1974 | 4 | 4 | |
| 9 | Фатаграфіі рабочых момантаў здымак тэлефільма "Время-не-ждёт" В.П. Чацверыкова ў групе з Д.Я. Зайцавым і неўстаноўленымі асобамі | 1975 | 2 | 2 | |
| 10 | Фатаграфіі рабочых момантаў здымак і кадраў мастацкага фільма "Половодье" В.П. Чацверыкова з удзелам А. Бабкаўскаса, Н.Д. Вавілавай, П.В. Кармуніна, Г.К. Макаравай, Ю.А. Марухіна (аператар) і неўстаноўленых асоб | 1980-1981 | 6 | 6 | |
| 11 | Фатаграфіі рабочых момантаў здымак і кадраў мастацкага фільма "Затишье" В.П. Чацверыкова з удзелам У.А. Аніська, М.С. Баярскага, Э.М. Гарачага, І.В. Дымчанка, В.Р. Ільічова, А.Я. Ліванава, Ю.А. Марухіна (аператар), В.Я. Чыпоўскай і неўстаноўленых асоб | 1981 | 16 | 16 | |
| 12 | Фатаграфіі рабочых момантаў здымак фільмаў "Сад", "Чорная берёза" і інш. В.П. Чацверыкова з удзелам Д.Я. Зайцава (аператар), Ю.А. Марухіна (аператар) і неўстаноўленых асоб | 1960-я гг.-1983 | 6 | 6 | |
| | *** | | | | |
| 13 | "Страницы из альбома о кино". Друкаванае выданне з фатаграфіямі В.П. Чацверыкова і кадраў яго фільмаў і інш. | 1996 | 51 | 1 | |
| | **2 АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ В.П. ЧАЦВЕРЫКОВА** | | | | |
| 14 | Ганаровая грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, дыпломы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, журы 15-га Ўсесаюзнага кінафестываля, запрашэнне на юбілейную сустрэчу з дня выпуску з Нахімаўскіх і Падрыхтовачнага ваенна-марскога вучылішчаў | 1974-1982 | 5 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 15 | Пісьмо глядачкі Н.[Е.]Тапароўскай на імя В.П. Чацверыкова з удзячнасцю за фільм "Затишье" | 1982 | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 16 | Артыкул пра студэнтаў "ВГИКа" са згадкай В.П. Чацверыкова і яго фота ў групе з У. Якаўлевым і | [1959-1962] | 2 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | неўстаноўленымі асобамі | | | | |
| | **3 ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 17 | Фатаграфіі В.П Чацверыкова, індывідуальныя | [1949-1970-я гг.] | 14 | 13 | |
| 18 | Фатаграфіі В.П. Чацверыкова ў групах з П.Ф. Друцкім, Ю.А. Марухіным і неўстаноўленымі асобамі | [1949 - 1980-я гг.] | 7 | 7 | |
| 19 | Фатаграфіі Антаніны Паўлаўны (маці), М.Л. Тарэвердыева, А. А. Кабаладзэ з дароўнымі надпісамі ад 6.03.1955 г., 21.04.1958 г., 1974 г. адпаведна на іх фатаграфіях і інш. | 1955-1974 | 4 | 4 | |
| 20 | Альбом з фатаграфіямі В.П. Чацверыкова падчас адпачынку, з сябрамі, калегамі і інш. На л. 14 - фатаграфія Святланы з дароўным надпісам ад 21 верасня 1957 г. на ёй | [1956 - 1970-я гг.] | 40 | 1/40 | |

У дадзены вопіс унесена 20 (дваццаць)
спраў з № 1 па № 20 , 135 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла:

вяд. архівіст Л.А. Дударэвіч
2024

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.